# МІРАВЫЯ ПАСРЭДНІКІ Ў СІСТЭМЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКАЙ

**Талмачова С.А.** **г. Мінск, БДПУ, канд. гіст. навук**

Для рэалізацыі рэформы 1861 г. ствараўся інстытут міравых пасрэднікаў, якія павінны былі рэгуляваць узаемаадносіны паміж вызваленымі сялянамі і іх былымі гаспадарамі. Другой інстанцыяй станавіўся павятовы з’езд міравых пасрэднікаў пад старшынствам павятовага прадвадзіцеля дваранства. Дзейнасць гэтай структуры кантралявала трэцяя інстанцыя – Губернская па сялянскіх справах прысутнасць – у складзе мясцовых чыноўнікаў і дваран начале з губернатарам [1]. Дзеля забеспячэння незалежнасці міравых пасрэднікаў было пастаноўлена, што зацвярджэнне іх на пасады, а таксама выдаленне ад яе, магло адбывацца толькі па пастанове Сената.

Палажэнні 19 лютага 1861 г. разглядалі інстытут міравых пасрэднікаў як судова-адміністрацыйную інстанцыю, якая павінна была прыміраць інтарэсы памесных дваран і сялян. Кампетэнцыя і паўнамоцтвы новага органа былі дастаткова шырокімі. На думку М.М.Дружыніна, шматлікія артыкулы спецыяльнага Палажэння аб губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах [1] (“Палажэнне”) можна аб’яднаць у чатыры асноўныя рубрыкі. Па-першае, міравыя пасрэднікі павінны былі разбіраць усе спрэчкі, скаргі і непаразуменні паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі. Па-другое,– і гэта была асноўная функцыя новага органа, – міравыя пасрэднікі павінны былі рэгуляваць узаемныя адносіны паміж памешчыкамі і сялянамі ў пяці асноўных напрамках: а) садзейнічаць заключэнню добраахвотных пагадненняў, на якія рабіў галоўную стаўку ўрад; б) зацвярджаць устаўныя граматы, што вызначалі надзелы і павіннасці сялян; в) кіраваць развёрстваннем і абменам зямельных угоддзяў; г) зацвярджаць выкупныя акты; д) сачыць за выкананнем сялянскіх павіннасцей. Трэці абавязак міравых пасрэднікаў складаў нагляд за дзеяннямі сельскага і валаснога самакіравання: назіранне за правядзеннем выбараў, за дзейнасцю сельскіх старастаў і валасных старшынь, а таксама зацвярджэнне прыгавораў аб выключэнні з сялянскай грамады “распусных” і “шкодных” яе членаў. Чацвёртую функцыю пасрэднікаў складала судовае разбіральніцтва спрэчак па пытаннях аб найме рабочых, аб арэндзе земляў, аб патравах і парубках лясоў, калі сума іску не перавышала 30 руб. Па ўсіх узбуджаных спрэчках міравы пасрэднік павінен быў дабівацца прымірэння бакоў ці трацейскага разбіральніцтва. У выпадку няўдачы ён мог прысуджаць адказчыкаў да грашовага спагнання, а ў выпадку правіннасці (калі вінаватыя належалі да падатнага саслоўя) – да грамадскіх работ, да арышту (да сямі дзён) ці да цялеснага пакарання (не больш за дваццаць удараў). У адносінах да выбраных прадстаўнікоў сялянскага самакіравання міраваму пасрэдніку давалася права рабіць заўвагі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і вымовы, прысуджаць штраф ці накладваць арышт і нават выдаляць і зусім знімаць вінаватага з пасады. На рашэнні міравога пасрэдніка можна было прыносіць скаргі павятоваму міравому з’езду, а на пастановы апошняга – губернскай па сялянскіх справах прысутнасці [1; 2, с. 30–31].

Рэалізацыя закону аб міравых пасрэдніках пачалася адразу пасля пачатку рэформы. Кіраўніцтва арганізацыяй сялянскіх валасцей, па арт. 20 “Агульнага палажэння” [20], ускладалася на губернскія па сялянскіх справах установы, якія паўсюдна сталі ствараццa ў сакавіку 1861 г. Яны ўключалі старшыню – начальніка губерні, губернскага прадвадзіцеля дваранства, кіраўніка палаты дзяржаўных маёмасцей, губернскага пракурора, двух членаў з мясцовых дваран-памешчыкаў, прызначаных міністрам унутраных спраў, і двух членаў з мясцовых дваран, абраных сходам губернскага і павятовых прадвадзіцеляў дваранства (“Палажэнне”, арт. 115–116). Пад кіраўніцтвам павятовых устаноў стваралася асобная камісія пад старшынствам павятовага прадвадзіцеля дваранства для складання праекта ўтварэння валасцей. Праект ішоў на зацвярджэнне губернскай установы, пасля чаго міравыя пасрэднікі павінны былі ўтвараць міравыя ўчасткі (“Палажэнне”, арт. 11).

На першыя тры гады міравыя пасрэднікі выбіраліся з мясцовых дваран-памешчыкаў. У 1861 г., калі толькі пачаўся падзел паветаў на міравыя ўчасткі, на якія распаўсюджвалася ўлада пасрэдніка, ў склад участкаў ўваходзілі ад 2 да 9 валасцей. У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі адбыўся новы падзел паветаў на міравыя ўчасткі і воласці. Гэта было выклікана палітычнымі матывамі. У цыркуляры Віленскага генерал-губернатара М.М.Мураўёва ад 2 лютага 1864 г. адзначалася, што пры ўвядзенні ў дзеянне Палажэнняў 19 лютага 1861 г. стварэнне валасцей і сельскіх грамад апынулася ў руках дваранства, якое прытрымлівалася толькі сваіх інтарэсаў. Таму ў многіх паветах “воласці і сельскія грамады вельмі дробныя…; з гэтых прычын – слабасць і разрозненасць сялянскага грамадскага кіравання; між тым, маючы на ўвазе цяперашнія палітычныя падзеі, пажадана было б, каб урад меў апору ў аднадушным дзеянні больш буйных адміністрацыйных адзінак” [3, л. 6]. Па загаду М.М.Мураўёва ад 10 кастрычніка 1864 г. дробныя воласці і грамады аб’ядноўваліся ў больш буйныя, якія складаліся не менш як з 1000 рэвізскіх душ, але з адлегласцю паміж паселішчамі і валасным праўленнем не болей 12 вёрст. Памяншалася і колькасць міравых участкаў, якія аб’ядноўвалі воласці ў межах губерняў [4, л. 6].

У 1863 г. ва ўсёй імперыі пачалося скарачэнне міравых участкаў і, адпаведна, колькасці міравых пасрэднікаў. Міністр унутраных спраў адзначаў у якасці прычын з аднаго боку, значнае змяншэнне заняткаў міравых пасрэднікаў і, з другога – імкненне да “палягчэння земства ў выдатках па ўтрыманню міравых устаноў”.

Расійскія даследчыкі гісторыі мясцовага кіравання адзначалі скарачэнне колькасці міравых участкаў у цэнтральных губернях [2, с. 30-37]. У беларускіх жа губернях гэты працэс меў дваісты характар. З аднаго боку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“змяншэнне заняткаў” вынікала са знішчэння абавязковых адносін паміж сялянамі і памешчыкамі ў заходніх губернях і стварэннем паверачных камісій. У выніку ў кампетэнцыю міравых пасрэднікаў у краі больш не ўваходзіў шэраг былых абавязкаў: 1) разбор спрэчак і скаргаў, што ўзнікалі з-за нявырашанасці пазямельных адносін паміж памешчыкамі і сялянамі (п. 1 арт. 24); 2) зацвярджэнне ў правільнасці складання і засведчання дабрачынных умоў, названых у арт. 26; і 3) амаль усе распарадчыя справы па арт. 27. З гэтага часу абавязкі міравых пасрэднікаў абмяжоўваліся галоўным чынам разборам спраў, што ўзнікалі паміж сялянамі па справах грамадскага сялянскага кіравання і ў вырашэнні спраў судова-паліцэйскага разбіральніцтва, вызначаных арт. 31 таго ж Палажэння. Акрамя таго, пасрэднік павінен быў удзельнічаць у рабоце паверачных камісій у яго участку. Таму Віленскі генерал-губернатар “лічыў карысным скараціць колькасць участкаў у самых шырокіх памерах, з падзелам паветаў на магчыма меншую колькасць участкаў” [14]. Аднак 1864 г. у беларускіх паветах Віленскай губ. было па два міравых участкі ў павеце, а ў 1869 г. – па чатыры [19; 21]. І гэта сведчанне асаблівасці дзяржаўнага кіравання Заходнім краем.

Сапраўды, у час паўстання і пасля яго падаўлення палітыка ўрада ў адносінах да грамадзянскай службы дваранства стала больш жорсткай. Па ўказу ад 18 красавіка 1863 г. у сувязі з выхадам у адстаўку 28 асоб Гродзенскай губ., якія займалі пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства, павятовых суддзяў і міравых пасрэднікаў, гэтыя пасады былі замешчаны чыноўнікамі па прызначэнні ўрада [5, с. 204]. 24 сакавіка 1863 г. Віленскі генерал-губернатар В.Назімаў у сваёй запісцы на імя міністра ўнутраных спраў пісаў, што ў сувязі з адстаўкай Гродзенскага губернскага прадвазіцеля дваранства графа Старжынскага, а за ім і міравых пасрэднікаў, ёсць падстава лічыць, што “такога роду дэманстрацыі з боку мясцовага дваранства маглі быць дапушчальны для ўрада, якому неабходна выкарыстаць гэты выпадак на сваю карысць, каб раз і назаўжды вызваліцца ад польскага дваранскага ўплыву, якое прысвоіла сабе права на замяшчэнне ўрадавых пасад членамі свайго саслоўя” [5, с. 214; 12, с. 336]. І паколькі пасады міравых пасрэднікаў замяшчаліся зараз “благанадзейнымі” асобамі, стала магчымым павялічыць колькасць міравых участкаў у Віленскай губ.

22 мая 1863 г. Віленскі генерал-губернатар адзначаў у справаздачы міністру ўнутраных спраў, што многія міравыя пасрэднікі самі прымалі ўдзел у паўстанні, “карысталіся сваім уплывам на сялян” для прыцягнення на свій бок. У сувязі з гэтым Віленскі генерал-губернатар загадаў у Віленскай і Гродзенскай губернях звольніць з пасад усіх міравых пасрэднікаў і кандыдатаў да іх, закрыць міравыя з’езды, і спыніць выдачу ўтрымання міравым пасрэднікам. Такія ж меры распаўсюджваліся і на Мінскую губерню, за выключэннем тых мясцовасцей, дзе губернатар “прызнае магчымы захаваць міравыя ўстановы”, а на пасады міравых пасрэднікаў прызначаны былі “як часовая мера, чыноўнікі ад урада, па выбару губернатара”. У Віцебскай і Магілёўскай губернях прапанавалася звольніць з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасад і замяніць урадавымі чыноўнікамі толькі "неблаганадзейных" міравых пасрэднікаў. Пры гэтым арганізоўвалася рассылка аб'яў па валасцях аб спыненні дзеянняў міравых установ, аб звальненні ад пасад міравых пасрэднікаў, каб паведаміць сялянам, што "улада міравых пасрэднікаў над імі спыняецца" [17, л. 3–3 зв.].

Добраахвотная адстаўка міравых пасрэднікаў паскорыла пытанне аб поўнай іх замене ва ўсім краі ўрадавымі чыноўнікамі. Па прадстаўленні Заходняга камітэта ў адпаведнасці з указам ад 27 мая 1864 г. усе службовыя месцы ў краі, а таксама і іх начальнікі, якія мелі непасрэднае дачыненне да народа, павінны былі быць заменены выключна асобамі рускага паходжання праваслаўнага веравызнання [5, с. 204]. У выніку, напрыклад, у беларускіх паветах Віленскай губ. у 1869 г. усе міравыя пасрэднікі былі праваслаўнага веравызнання, і ўсе пасады займалі, пачынаючы з 1863 г. ці пазней. Пры гэтым 9 з 16 міравых пасрэднікаў былі ўзнагароджаны медалём "у гонар уціхамірання польскага мецяжу 1863–64 гг." [19, с. 159–160, 170–171, 176, 182–183].

Новых міравых пасрэднікаў пачалі набіраць са складу сваіх служачых тры міністэрствы: МУС, дзяржаўнай маёмасці і юстыцыі. Звычайна гэтых чыноўнікаў, якія не валодалі зямельнай уласнасцю ў краі і не мелі сваякоў сярод мясцовых памешчыкаў, запрашалі з унутраных губерняў Расіі [5, с. 214; 15, № 40366; 16]. У сувязі з тым, што іх абсалютная большасць не мела іншага даходу, акрамя жалавання, ім павялічылі надбаўку да яго на 50% [5, с. 214; 15, № 39935]. Урад спадзяваўся не толькі палепшыць іх матэрыяльнае становішча і заахвоціць службай у краі, але і зрабіць іх матэрыяльна незалежнымі ад мясцовых памешчыкаў. У прыватнасці, у 1865 г. у беларускіх паветах Віцебскай губ. толькі два пасрэднікі атрымоўвалі гадавое жалаванне ў 1500 руб., астатнія – па 2000 ці 2500 руб. Гэта азначае, што толькі гэтыя два былі з мясцовых дваран [18, с. 15–17]. Акрамя гэтага, на ўсіх чыноўнікаў, якія накіроўваліся на службу ў заходнія губерні, распаўсюджвалася правіла, па якому яны прыраўноўваліся да служачых аддаленых губерняў Расіі. Тэрмін абавязковай службы на месцы быў скарочаны з трох гадоў да двух. Гэтыя льготы садзейнічалі шырокаму наплыву чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі. Папячыцель Віленскай вучэбнай акругі ў 1864 г. вымушаны быў прызнаць, што на заклік М.Мураўёва разам з дзесяткамі чэсных і дзелавітых людзей у краі з'явілася і мноства "галодных, якія шукалі крыніцы нажывы, асоб" [5, с. 214–215].

Гэты працэс знайшоў рэзананс у перыядычным друку. Так, Д.Мірапольскі распавядаў пра адмоўную дзейнасць міравых пасрэднікаў з мясцовых дваран польскага паходжання у Паўночна-Заходнім краі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. [8, с. 183]. Ідэалізуючы дзейнасць міравых пасрэднікаў ва ўнутраных губернях, Д.Мірапольскі звяртаў увагу грамадскасці да таго, што ў беларускіх губернях яны "умешваліся ў грамадскае сялянскае самакіраванне" [9, с. 274]. Адначасова ён сцвярджаў, што многія міравыя пасрэднікі рускага паходжання, што прыязджалі на азначаныя пасады з унутраных губерняў, былі яўна няздольнымі выконваць складаныя абавязкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па кіраўніцтву сялянамі, а таксама паказалі "відавочны, нічым не прыкрыты гвалт у розных відах і формах", што "прызначэнні на пасады рабіліся на авось, абы як" [10, с. 205–206]. Аднак пры гэтым аўтар тэндэнцыйна сцвярджаў, што большасць тых, хто прыехаў, былі значна лепш за былых. Такім чынам, у карэспандэнцыях з беларускіх губерняў адказнасць за няўдалае правядзенне рэформы ўскладалася на міравых пасрэднікаў "польскага" паходжання.

Сапраўды, часам міравыя пасрэднікі нядбайна выконвалі свае абавязкі. Так, з 1861 па 1865 г. з-за абыякавасці аднаго з міравых пасрэднікаў Барысаўскага павета Мінскай губ. некаторыя воласці (у прыватнасці, Латыголіцкая і Свядская) па два разы пераводзіліся з аднаго міравога ўчастка у другі, пры гэтым прычыны падобнага пераводу Мінскі губернатар лічыў беспадстаўнымі – міравому пасрэдніку было нязручна прыязджаць у названыя воласці. Губернатар у 1865 г. адзначыў, што гэтыя воласці знаходзіліся ў значным заняпадзе ў параўнанні з іншымі валасцямі павета, а былы міравы пасрэднік наведваўся ў названыя воласці толькі два разы за ўвесь час. У выніку паселішчы Латыголіцкай воласці былі прылічаны да двух іншых валасцей [11, л. 185–186].

Міравыя пасрэднікі павінны былі зацвярджаць кандыдатуры асоб, абраных на пасады валасных старшынь, сельскіх старастаў ды інш. З гэтай прычыны ў сувязі з паўстаннем лічылася, што першыя службовыя асобы сялянскага самакіравання былі абраны пад кіраўніцтвам і ўплывам польскай шляхты. "Многія пасрэднікі... пастараліся ў першы год сваёй дзейнасці ўвесці ў арганізацыю валасных праўленняў магчыма большую колькасць элементаў, здольных аддаляць сялян ад думкі, што яны жывуць на рускай зямлі... На пасады валасных старшынь выбіраліся толькі асобы рымска-каталіцкага веравызнання, гатовыя выконваць волю міравых пасрэднікаў" [6, с. LXXXV]. Таму, не чакаючы заканчэння трохгадовага тэрміну дзеяння папярэдніх выбараў, у чэрвені 1863 г. М.М.Мураўёў загадаў ажыццявіць "новыя выбары на пасады валасных старшынь і сельскіх старастаў пад наглядам павятовых ваенных начальнікаў", каб гэтыя выбары "былі праведзены без усякага ўплыву памешчыкаў" [7, с. 120]. Такім чынам, арганізацыя сельскіх грамад і валасцей, выбар службовых асоб і інш. ставіліся ў залежнасць ад палітычных меркаванняў цэнтральных і мясцовых улад, а асабістыя якасці асоб міравых пасрэднікаў не браліся пад ўвагу.

Пытанне аб неабходнасці захавання пасады міравога пасрэдніка і аб яго кампетэнцыі неаднаразова паўставала ва ўрадавых колах. У прыватнасці, Міністэр унутраных спраў П.А.Валуеў лічыў, што міравыя пасрэднікі маюць занадта вялікія паўнамоцтвы і пастаўлены ў поўную незалежнасць ад мясцовай адміністрацыі. Ён пастуопова абмяжоўваў правы міравых пасрэднікаў і яшчэ да 1863 г. імкнуўся замяніць іх прызначанымі чыноўнікамі. У цыркуляры ад 24 мая 1861 г. Валуеў патрабаваў ад губернатараў "пільнага і настойлівага назірання" за дзейнасцю гэтага органа, а ў цыркуляры ад 30 кастрычніка 1862 г. паставіў пытанне аб мэтазгоднасці

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

скасавання пасады міравых пасрэднікаў як органа, які звязваў рукі мясцовай адміністрацыі [2, с. 32, 36].

Галоўны камітэт не згадзіўся на неадкладнае скасаванне інстытута пасрэднікаў, але прызнаў неабходным паступовае змяншэнне колькасці міравых участкаў. Аднак у адозве 4 ліпеня 1863 г. Віленскі генерал-губернатар лічыў захаванне міравых участкаў у краі "асабліва зручным у цяперашні час, калі ў выніку закрыцця былых міравых устаноў вызначацца новыя міравыя пасрэднікі ад урада" [14]. Акрамя таго, законам 20 лістапада 1864 г. Дзяржаўны савет скараціў кампетэнцыю пасрэднікаў, перадаўшы іх судовыя функцыі новаўтвораным міравым суддзям [2, с. 36].

Новы міністр унутраных спраў А.Е. Цімашаў у 1868 г. склаў дакладную запіску аб неадкладным скасаванні пасады міравых пасрэднікаў і размеркаванні іх функцый паміж судовымі органамі, павятовай паліцыяй і асаблівымі папячыцелямі над сялянствам, прызначанымі з мясцовых памешчыкаў і падначаленых губернатару. Аднак гэты праект не быў зацверджаны. У 1873 г. А.Е. Цімашаў прадставіў у Галоўны камітэт новы праект аб паступовым скасаванні інстытута міравых пасрэднікаў. Міністр унутраных спраў лічыў гэтую пасаду "не толькі мала карыснай ці зусім лішняй, дарэмна абцяжарваючай земскія сметы большасці губерняў, але і ў многіх выпадках шкоднай, уяўляўшай з сябе значную перашкоду для губернскай адміністрацыі ў адносінах канкрэтнага і хуткага выканання ўскладаемых на яе абавязкаў" [2, с. 37].

Праект 1873 г. абмяркоўваўся ва ўрадавых колах і выліўся ў форму закону 27 чэрвеня 1874 г., па якому ва ўнутраных губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны. У Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў скасаваны ў 1878 г., калі за дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання сталі назіраць неад'емныя члены павятовых па сялянскіх справах устаноў, а з 1901 г. – земскія ўчастковыя начальнікі. У Віленскай і Гродзенскай губернях міравыя пасрэднікі захаваліся да 1904 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура і крыніцы**


1. Высочайше утвержденное Положение о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях. – Полное собрание законов Российской империи. – 2-е собр. – Т. XXXVI. – Отд. I. – СПб., 1863. – № 36660.
2. Дружинин, Н.М. Русская деревня на переломе 1861–1880 гг./ Н.М. Дружинин. – М.: Наука, 1978. – 288 с.
3. Дело по предписанию Минского губернатора об объединении мелких волостей и сельских обществ // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ). – Фонд 242. – Воп. 1. – Спр. 198.
4. Сведения мировых посредников для годового отчета о ходе крестьянского дела в Минской губ. за 1865 г. // НГАБ. – Фонд 242. – Оп. 1. – Спр. 417.
5. Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.: манаграфія / А.П.Жытко. – Мінск: БДПУ, 2003. – 233 с.

6. Сборник документов музея графа М.Н.Муравьёва /сост. А.Белецкий. – Вильна: Тип. “Русский почин”, 1906. – LXXXIX+233 с.

7. Сборник распоряжений графа М.Н.Муравьева по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863–1864 /сост. Н.Цылов. – Вильна: Тип-я Киркора, 1866. – IV+384 с.

8. Миропольский, Д. Из Северо-Западного края / Д.Миропольский // Беседа. – 1871. – № 11. – С. 183–203.

9. Миропольский, Д. Из Северо-Западного края / Д.Миропольский // Беседа. – 1872. – № 6. – С. 273–303.

10. Миропольский, Д. Из Северо-Западного края / Д.Миропольский // Беседа. 1871. – № 10. – С. 198–212.

11. Дело о доставлении губернаторами списков волостей и сельских обществ // Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. С.-Пецярбургу (РДГА). – Фонд 1291. – Воп. 36. 1862 г. – Спр. 67.

12. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края // Виленский временник. – Вильна, 1913. – Кн. VI.

13. Журналы Секретного и Главного комитетов по крестьянскому делу. – Пг., 1915. – Т. I. – С. 376–381, 386–389; Т. II. – С. 27–29.

14. Переписка с Минским губернским правлением с изложением содержания указов Сената, циркуляров и предписаний Минского губернатора по вопросам устройства и управления крестьянами в связи с реформой 1861 г. (30 декабря 1865 – 27 апреля 1866 гг.) // НГАБ. – Фонд 242. – Воп. 1. – Спр. 415.

15. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 38.

16. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 39. – № 41066.

17. Дело о мировых посредниках Западных губерний // РГИА. – Фонд 1291. – Воп. 36. 1863 г. – Спр. 33.

18. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год / Изд. Витебским губернским статистическим комитетом / под ред. А.М.Сементовского. – СПб.: Тип. К.Вульфа, 1865. – VIII, 376, 128, 7 с. – Ч. 2: Отдел справочный.

19. Памятная книжка Виленской губернии на 1869 год. – Вильна: Тип. Губернского правления, 1869. – 213 с.

20. Высочайше утвержденное Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости // ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. XXXVI. – Отд. I. – № 36657. – СПб., 1963.

21. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год (по 26 марта 1864 г.). – Вильна: Тип. А. Сыркина, 1864. – VIII, 168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ